Віктар Іваноў



...людзі мяняюцца, нараджаюцца,
сыходзяць – пах застаецца...

# Подыхі творчасьці.

*Кожны творца пакаленьня next цягне коўдру
літаратуры на сябе. Гэты яркі індывідуалізм неабходны
для ўзьнікненьня жорсткай канкурэнцыі,
у выніку якой нараджаецца якасная літпрадукцыя.*
В. Т.

*Да чаго ж салодка ўспорваць ягонае маленькае пузічка.
Там растуць казяльцы і смачна пахне
абадранымі каленьнямі дзяцінства...*
Адзін з узораў.

***Разьдзел першы, або ПРЫЕЗД ПАНІ.***

***1.***

Ва ўсіх сучасных жанрах, ад інсталяцыі да перформансу, цяпер працаваў Паша Пасюкевіч.

Сёньня, напрыклад, улюбёнаю тэхнікай была аква-бамбістыка. Каб стаць аквабамбістам, трэба,

па-першае, адкруціць душ ад шлангу, а па-другое, круціць струмень над вадою. Сачыце за чысьцінёй выкананьня: кроплі маюць атрымацца тоўстыя, сапраўды быццам бомбачкі.

Але ж – ці то з-за надта спрытных пальцаў паэта, ці хутчэй таму, што ў хаце не было ніводнага гледача, – новы стыль выявіўся недаўгавечным, і апошнія хвілінаў сорак Пасюкевіч проста ляжаў.

І вось у той момант, калі ён ужо канчаткова вырашыў узяць шампунь, у тую самую хвілю зазваніў тэлефон.

– Алё? Паш? Гэта я. Я ўжо на прыпынку. На пры-пын-ку! Усё, давай.

На прыпынку... Блізка. Давядзецца сядзець ня мыўшыся. Шкада – наўрад такая пасрэднасьць, як Волюшка, зацэніць тонкі эпатаж, якім патыхае ў атмасферы. Трэба нешта дзеля супрацьвагі...

Паэт знайшоў на антрэсолях гумовыя боты. Цяпер ужо паміж пахам і абліччам была пэўная гармонія; да Волінага прыходу Пасюкевіч разгарнуў цэлую тэорыю, а менавіта тэорыю гігіенічнай адноснасьці. Вынікала, у прыватнасьці, што падчас дэфіцыту можна цудоўна прадаваць такія вось боты па талонах на мыла.

Ліфт працаваў, і Вольга падымалася ўсё вышэй.

Усе боты трэба аднаго памеру, сорак трэцяга, тады кожны пакупнік атрымае ўласныя, унікальныя адчуваньні.

Волюшка прачытала шыльдачку, паводле якой

**Тут у 1971 годзе нарадзіўся і жыве**
**малады творца**
**Павал Пасюкевіч**

і націснула вельмі гучны званок.

Адчыніў сам, і на твары быў той непераймальны выраз *Штангі-думак-саскочылі-з-правадоў-паэзіі-і-вобразы-вылецелі-праз-адчыненыя-форткі-вачэй*, што й тры гады таму. Як быццам нікуды яна не зьяжджала, а сядзела з Пасюкевічам у Менску.

Ён правёў яе ў вітальню, даў распрануцца, пачаў паказваць музей – усё з такім самым тварам, – і вось яна, нарэшце, пакінула меркаваньне ў кнізе водгукаў і пайшла накрываць на стол.

А ўрэшце, боты замест мыла — ідэя прахадная, для няздарных паплеч-нікаў, а сапраўднага творцы ня вартая. Ён паставіў іх у «Новыя паступ-леньні», таксама пайшоў у гасьцёўню. Яскравы дысананс крухмальнае бялізны і ліпучага цела стаўся цяпер прадметам гонару.

Елі: Волюшка рукамі, Пасюкевіч – сёньня – нажом і відэльцам.

Вось да якога чалавека яна прыехала, і вось у чыёй кватэры давядзецца жыць гэтыя два тыдні.

Рызыкаваў, дарэчы, страшэнна. Тупы, у засохлых кроплях нож не жадаў рэзаць, і праўдалюб-відэлец выскокваў з рукі. З жудасным скрыгатам чапляліся яны адзін за аднаго, а на гаспадара забыліся. І яшчэ хацелася паліць.

Сьвяточная курыца стаміла абодвух, а ня толькі адну Волюшку.

А вось на кухні, за гарбатаю, паэт уздыхнуў вольна, і, калі госьця пачала была там нешта пра сваю вёску, уставіў такія пяць капеек:

– Сьпіш у музеі. На раскладушцы.

– Дык вось слухай, якая потым вясёлка была, – працягвала сваё.

– Дабранач, – адказаў паэт і паставіў торт у лядоўню.

## 2.

Вершы не прыходзілі.

Ствараў Пасюкевіч на кухні – як, зрэшты, і заўсёды, – і ніякіх бацькоў на раскладушцы не было; дый і раскладушкі не было, на ёй спала госьця. Сёньня, такім чынам, пісаць не перашкаджаў ніхто.

А вось жа – не пісалася. Не было ад чаго адштурхнуцца.

Трэба ўзяць якое-небудзь друхло, вырашыў паэт, *літугнаеньне*, і як сьлед абсьцябаць. Ён пайшоў у залу, доўга чытаў назвы і спыніўся на «Выпускниках», атрутна-блакітных і жахліва ілюстраваных.

Скобелеў, аднак, спадабаўся – няўцям, чаму й за няздару лічаць. Не, ну да сучасных тэкстаў, вядома, як да месяцу, – а як на рэалізм дык і нядрэнна, з гумарам нават. Нядрэнны Скобелеў быў закінуты на лядоўню, і далей Паша не рызыкаваў, сьцябаўся завочна.

Беларуская літаратура, прыдумаў выслоўе авангардыст Пасюкевіч, *сьмяротна кволая*. Такую трэба перапісваць ад нуля. Усюды (зірнуў на Скобелева), усюды прадажныя *БэСэСэШэрыя* графаманы і з кожным яму трэба змагацца – сапраўды, толькі волат выратуе гэтую літаратуру.

Паэтычны маніфест – і які! – быў амаль у кішэні.

У зборы твораў гэты тэкст, мажліва, пададзены ў іншых версіях, то паслухайце, як гучала першапачаткова.

**ЛІТВОЛАТ**

Во лат
ыніне
Воля
наляцінула на
мяў... НЕ!,
я ў не-
сьвядомасьці,
дома ці
на дне?

Паэт верш вельмі ўпадабаў. Спачатку проста перачытаў яго – разоў дзесяць, ня болей. Потым уявіў, як гэткі твор успрыме Ларыса Герасімаўна (Пасюкевіч раз-пораз завітваў у школку), – і, ведаеце, было чым ганарыцца: палову з*вышсучасных моўных правакацыяў* уяўная вучылка не зразумела, нават не заўважыла.

Думаеце, супакоіўся? Ха!

Схадзіў у майстэрню, вярнуўся з «Нацыяй Кульмі» і «Уводзінамі ў самадызайн». Перачытаў кожную паэму двойчы, вярнуўся да сёньняшняга верша і чырвонай асадкай – знайшоў у кабінеце, – асадачкай пазначаў, пазначаў, пазначаў: алюзіі, цытаты, элементы самапародыі... Потым, падсумаваўшы заўвагі, пісаў на гэтым матэрыяле эсэ. Прачытаў эсэ, натхніўся і хуценька, пакуль натхненьне не павісла,

стварыў другі верш. Потым доўга чакаў трэці. Паэмы ня дзейнічалі, замыленыя, зачытаныя да дзірак. І таму...

А ў музеі спала сястра. Ха-ха.

Было трыццаць хвілінаў на чацьвёртую.

**3.**

Ён быў зусім невялікі, музей паэта Пасюкевіча. Васемнаццаць метраў пакой, ды чатыры балкон, ды сёе-тое ў майстэрні.

А ўсіх пакояў было чатыры: да музею, майстэрні і гасьцёўні яшчэ кабінет, у ім паэт адпачываў і слухаў музыку. Іншымі словамі, пашырыць музей можна толькі за кошт гасьцёўні. А ў гэтым выпадку, здагадваўся Пасюкевіч, бацькі будуць супраць пашырэньня.

Волюшцы між тым ня спалася. Яна падышла да часопіснага століка, на які брат клаў сьвежае. Амаль кожны экспанат суправаджаўся і артыкулам – грунтоўным, добрасумленным, на фінскай паперы.

*Вар'янты паэмы «Нацыя Кульмі», уватрапіўшыя ў нашы музэй 19 чэрвэня, былі аднойдзеныя на дачах бацьком паэты. Пэршы вар'янт датуецца 23эцяга студня, другі – 25ятага студня. Паводльле стыля абодвы вар'янты найлежуць да Асноўнае Творчае Пасьлядоўнасьці (АТП) і зьяўляюцца*

Яна перагарнула старонак колькі.

*бэсталянымі гэпігонськімі спрабаваньнямі. Ў дадзеных двох вар'янтах гэтая барадзьба прасьлейжджваецца йшчэ й ў главе «Аб...Лене», асабіста у рыфу «галасочак – галаслоўны», прысутнічаючага ў абядзьвёх вэрсыёх, пры чым вар'янт ад 25 студня сьпейрш ўтрымаўляў рыф «галадовак», памяняны аўтарам на п'ершапачаткавы, чым яскравейшым вобразам падкрасьлёнае, што*

Вольга не заснула. Гучна тахкаў гадзіньнік. На вуліцы трамваі.

У іншым кутку стаяла вежа. Упершыню яна была створаная ўлетку восемдзесят сёмага, а матэрыялам стаў нямецкі канструктар; цяпер гэта «апомнік эрхытэктурнае створчасьці позьнетрадыц'ялісцкага пэрыёду», «растаўрованы аўтрам у сьнэжні 1990 году», і Волюшка адыйшлася: яшчэ, крый Божа, пабурыш...

Адчыніла шафу, пачала разьбіраць паэтавы сшыткі.

Калі-небудзь пазьней усе тыя сшыткі будуць, вядома ж, апублікаваныя. А пакуль – пакуль нават у музеі Пасюкевіч выставіў мала, літаральна некалькі ўзораў. Усе астатнія – стос за дзявяты, стос за дзясяты клас – і ляжаць вось у гэтай шафе.

Вольга шукала сшытак, у якім было сачыненьне.

Аднойчы вучань Пасюкевіч напісаў вельмі дзіўнае сачыненьне. Па-першае, у вершаванай форме.

Пасюкевіч быў ужо сапраўдным віртуозам. Ягоныя вытанчаныя рыфмы (мачай ні к/сабе, ні к яму. А – к/таму, хто чырвоны чайнік/прыхуе[1] ад чарвёў-камуняк) не саступалі нават вершам шасьцідзясятнікаў. Радкі ламаліся на такую барочную «лесьвічку», што страшна ўзгадаць, і сям-там было цяжка нават падлічыць, колькі іх у той верш напіхана.

Вось якую вершаваную форму я маю на ўвазе.

І, па-другое, зьмест. Пасюкевіч сьцьвярджаў, прыкладам, што Павел Уласаў быў схаваным гомасексуалістам і што Аляксей Талстой сублімаваў такім чынам уласнае прыгоннае дзяцінства.

– Гэта будзе БОМБА! – прызнаваўся напярэдадні паэт у цесным сямейным коле.

Якую адзнаку ён атрымаў, Волюшка не даведалася. Але цудоўна памятала, што пасьля сачыненьня Паша ператварыўся ў таго самага Пасюкевіча, якога мы з вамі ведаем.

Сачыненьне яна знайшла і, здаецца, прачытала. Потым дабралася да ложку і заснула.

## *Разьдзел другі, або Жыцьцё з ідыёткай.*

### 1.

У Міністэрстве адукацыі сядзяць адны ідыёты.

Сапраўды. Ну чаму б, чаму б не паставіць тую падачу дакументаў пасьля абеду? Студэнты пасьпелі б табе і адпачыць, і прачытаць, што ім трэба, і пад’есьці два разы, не студэнты а абітурыенты, і пагаліцца, хто які голіцца, і прычасонца лётна спыт.

Так думаў Пасюкевіч пад тонкай, наскрозь прапацелай коўдраю. А часьцей думаў проста: «Тваю!»

Ён параўнаў коўдру з блінам: тлустая і гарачая. Бліны з паэзіяй – неблагая страва. Ша! Ешце, сволачы! Я ж волат, яжвы3ваю. К100ўным 100чывам абсы5. Я1 у*0 с11/\1-0

Вольга зайшла ў пакойчык бяз вокнаў.

«Якога? Унітазы трэба выра%^@ць з мяккіх, разумееце?! Мяккіх матар’ялаў, і ціхіх, можа хоць тады яны янбудуць рып засыпець» – Пасюкевіч хацеў тут нават падняцца, намаляваць канструкцыю, і маляваць жа ўмеў быў у сьне...

На вялікай канфорцы, на чыгуннай патэльні Волюшка смажыла яечню – так-так, яечню, Пасюкевіч-старэйшы меў блат, – а за сьценкаю, нібы вугор, круціўся малады творца і пляваўся гарачымі думкамі.

«Ды калі ж яна... калі ж адсюль... калі яна...», потым «Дай-Це Па-СПАЦЬ!!!» (карцела ўголас, усё выбіраў момант), «Бль... бль... Т?ваю!» – о так, наш мысьляр за думкай у кішэню ня лез!

Волюшка пайшла, а брату доўга шчэ не засыналася. Рамонтаў суседзі не рабілі, музыку ня слухалі (нават Жэка з восьмага паверху) – езьдзілі сабе на ліфтах ды гутарылі аб розным. А на гадзіньніку было 10:54.

Пасюкевіч усё трымаў сябе ў ложку. Сон карысны для здароўя і дае новыя мастацкія знаходкі. Трэба дацягнуць хаця б да першае, інакш – галава баліць, вочы чырвоныя... бррр!

У дванаццаць дваццаць пабудзіў тэлефон. Спачатку хацелі нейкага Міхалыча, другі раз была *цоца* з мамінае працы, якая да таго ж не зразумела Пашаў жарт.

Пасюкевіч піў бразільскую каву з шакаладнымі цукеркамі. Ён прыгадаў... так, прыгадаў: сёньня ісьці ў выдавецтва. У выдавецтва, дзе таксама саўкі ды нікчэмнасьці і ніхто (цукерку ў рот) не разумее Вольнае Мастацтва, і нават найвыбітнейшага... прыгожыя гукі: на-

ватна-йвыбі-тней-ша-га... – найвыбітнейшага прадстаўніка (яшчэ цукерку!) ня возьмуць. Ну, то ім жа горш – вырашыў і пачаў зьбірацца.

Дарогай паэт вынайшаў геніяльную рыфму «ніштаваты – ніякаваты» – літаральна прасілася ў «Нацыю Кульмі-2», – і правёў сем прыпынкаў да метро ў салодкіх творчых пакутах.

А яшчэ ён думаў, як цудоўна, што Волюшка прыехала на цэлыя два тыдні, а што бацькі якраз на лецішчы (утрох на раскладушцы было б цесна). Цяпер яна і музей пашырыць дапаможа, і часу хопіць. А іх тады можна перад фактам. Не асабліва тая гасьцёўня й трэба, я б сказаў.

З гэткімі вось прыемнымі думкамі Пасюкевіч і прыйшоў у выдавецтва.

Нікчэмная саўковая рэдактарка друкавала на машынцы, і паэт зайшоў ззаду, каб паглядзець праз плячо.

**2.**

Музей вырашыла не чапаць. Гасьцёўню прыбіралі бацькі, там збольшага чыста.

Вольга вярнулася першая. Яна падала дакументы і пазнаёмілася з самым цудоўным хлопцам Менску. Ёй карцела таньчыць і сьпяваць. І яшчэ карцела зрабіць і брату нешта прыемнае...

Прыемнае шт*о*? У крамах нічога няма. Сваімі рукамі яна ўмела... не, ну ўмела маляваць, умела вышываць крыжыкам, умела... толькі на такія рэчы брат заўсёды пляваў з вышыні мастацкага густу.

І вырашыла яна тады прыбраць у кватэры.

Уявіце: вы прыходзіце дадому. Тупая рэдактарка паслала вас на тры літары. У метро цісканіна, у трамваі таўкатня – сем прыпынкаў трэсьліся вы зайцам. Смурод у пад'езьдзе і гэтак далей, і гэтак далей, і гэтак далей. На душы пагана, таму што ведаеце: у кватэры – тут дзяўчаты хай лепей не чытаюць – у вашай кватэры срач. З такімі думкамі вы адчыняеце дзьверы.

Кватэра зьзяе чысьцінёю. Усе кнігі стаяць па паліцах, акрамя адной улюбёнай – тая на пісьмовым стале. Падлога чыста вымытая, а шкарпэткі нехта пазьбіраў і таксама памыў. І нават адшукаў парныя пад шафаю. І дастаў з-пад канапы дзьве пешкі, з-за якіх вы два гады ня гралі ў шахматы.

А на кухні п'е каву ваша сястра і загадкава ўсьміхаецца.

Уявілі? Дык вось: заходзіць Воля ў майстэрню...

А як, між іншым, усё цудоўна пачыналася!

Я маю на ўвазе, вядома ж, не дзяцінства. Паэт добра памятаў тупую бздурную малую, яна кпіла з ягоных рыфмаў і аднойчы ўзяла ды заявіла літаральна: «Табе няма проста чаго рабіць!».

Я пра тую Вольгу, ад якой заўчора прыйшла з вёскі тэлеграма. Цяпер Паша зьбіраўся дараваць амаль усю ейную тупасьць і марыў. Вось прыедзе, сядуць яны куды-небудзь, і паэт будзе проста, як роўны

роўнаму, тлумачыць *актуальныя эстэтычныя тэндэнцыі.* Калі чытач дазволіць, я агучу тыя тэндэнцыі.

*Будучыня драматургіі – не састарэлы тэатар абсурду, а тэатар сумбуру, які...* далей паэт не прыдумаў, вяртаўся да пачатку. Пачатак быў вельмі добры, і гэта супакойвала.

Або, напрыклад, *тэхніка не галоўнае, таму што яе можна напрацаваць. Прафесіяналізм – забаўка для нядараў, а творца*, як прызнаваў нават Ісакоўскі, *заўжды ня ўмее пісаць.*

Пасьля гэтае гутаркі можна б даць які-небудзь прыклад (ды Скобелева таго ж) і спытаць у Волюшкі, як яна лічыць, якім тэндэнцыям ён адпавядае, а якім не, і чаму. А там, паэт ведаў, бачна будзе.

І вось – не было бачна. Ня ведаў, як і падступіць да сястры.

## ***Разьдзел трэці, або Вясковы пЕрыяд***

**1.**

Я пазнаёміўся ўпершыню з Пасюкевічам улетку 19** году. Ён быў амаль сярэдняга росту, з даўгімі і яшчэ густымі валасамі, якія ён меў звычку закідваць рукою назад. Легендарны Луіджы тады ўжо ня меў таго славутага позірку, за які ён атрымаў у літаратурных колах сваю другую мянушку. Ён кульгаў тады крыху на хворую нагу, якую параўнаўча нядаўна пашкодзіў тут у гэтай вёсцы, але аднак, тым ня меней, ён, безумоўна, адрозьніваўся больш чым звычайнай прыгажосьцю.

Паэт правёў мяне да сябе ў свой дом, дзе было прахалодна адносна гарачага летняга дня, гэты дом быў вельмі цікава абстаўлены: на стале ў маляўнічым непарадку ляжалі буйнафарматны сшытак, геаграфічны атлас, томік Вазьнясенскага, «Іліяда», старыя кружэлкі на 78 абаротаў і старыя фламастары выразна шэрага колеру. Я крадком адгарнуў сшытак, на першай старонцы быў зьмешчаны Пасюкевічам вадзяны дзіск правільнай формы, намаляваны фламастарамі самім паэтам гэтым ранкам.

Сустрэліся мы сапраўды ўлетку 19** году. Адразу скажу, што сшытак ляжаў там, дзе й сёньня – пад ножкаю стала, не пісьмовага, а які на верандзе.

Што мяне зьдзівіла ў Пасюкевічу? Ну, нават ня ведаю. Пачнем з пазногцяў. У Пасюкевіча былі слаістыя, даўно ня грызеныя пазногці адстаўнога музыкі; некаторыя ён ламаў і недаламаў.

Гэты вялікі паэт, будучы цыклапічнай мастацкай фігурай, жыў тады ўсё роўна ў сьціплай вёсцы і сваім прыватным доме, не праяўляючы тым самым ніводнага забабона, на якія ён, дзякуючы свайму унікальнаму становішчу ў літаратуры, меў поўную рацыю.

Калі да яго прыехаў рэпарцёр са сталіцы браць у яго інтэрв'ю, Пасюкевіч рашуча прагнаў яго назад, што хутчэй за ўсё тлумачыцца ягоным веданьнем таго, што ён ня хоча сабе недарагой скандалёзнай

вядомасьці, кажучы з рознай швальлю на гэты кшталт, і таму ён гэта і зрабіў дакладна па гэтай самай прычыне.

Кожная хата м*а*е свой пах. Людзі мяняюцца, нараджаюцца, сыходзяць – пах застаецца. Я заўважыў гэта ў дзяцінстве, калі гасьцяваў у расейскіх сваякоў, і чарговы раз упэўніўся ў гэтым летась.

У Пасюкевічавым доме ня так. Раней тут жыла Волюшка і пах быў адзін; у год знаёмства з Пасюкевічам ужо не засталося нічога ні ад ейнага, ні нават ад спрадвечнага водару.

А завяршэньне гэтага апісаньня нам хацелася б зрабіць словамі самога паэта, напісаўшага ў гэтым выпадку так:

патыхае творчасьцю
падыхае
рэдактарка і дыхае
паэт. Хайль
Творчасьць! Патыхае
ёю і хай
сабе,
абы кабы мне,
а ім – не.

Гэтая паэтызацыя традыцыйна малавядомых мастацкай эстэтыцы дзеяньняў і выбівала нашага выбітнага сучасьніка.

Сшыткі вяліся дробным почыркам. Пасюкевіча хапала старонкі на тры, чатыры. Потым ішлі накіды – чыстая старонка, у цэнтры закрэсьленая лінія ці два-тры словы. Вось адзін малюнак, постаць ваяра. Паша намаляваў дзьве версіі: першую пазначыў 1991 годам, а другую, нерасфарбаваную, без галавы, – 1993. Пераваліўшы такім чынам за сярэдзіну, мастак відавочна страціў цікавасьць.

## 2.

Калекцыя скарыстаных прэзерватываў захоўваецца ў адмысловай шуфлядзе. Пад кожным прэзерватывам стаяць лічбы. Спачатку адзінка альбо двойка, потым пасьля двукроп’я двузначны лік з прамежку 02..57; у наступным радку дроб ад 0,3 прыблізна да 0,5 – раз сустрэлася 0,923 і ў дужках тры клічнікі.

Прэзерватывы, пазначаныя літарай Z, нумаруюцца інакш. Тут ужо не адзінка і ня двойка, а найчасьцей нулік; на месцы ж дробаў стаяць трохзначныя лікі, у сярэднім сто шэсьцьдзясят.

Ляжыць у шуфлядцы і секундамер, і чыстая лейка, і сіняя ізаляцыйная стужка, і іншыя неабходныя прыстасаваньні.[1]

Волюшка спачатку не зразумела, шт**о** калекцыянаваў брат, і толькі калі патыхнула... тым самым, тады толькі здагадалася. Стаяла Волюшка хвілінаў мо... ня ведаю колькі. Ведаю, што халадок нейкі падмарозіў карані валасоў; і думка — брат гэта адно, а прэзерватывы зусім іншае...

Дык ён мо ня ведаў! Яму падкінулі!

[1] Мы ня будзем тут удакладняць, дзеля чаго яны неабходныя. А маглі б.

Яна адчыніла шуфлядку. Почырк, почырк!

Ягоны. Як у сачыненьні, дакладна. Пайшла ў музей, узяла сачыненьне, параўнала... Прынесла сачыненьне і яшчэ адзін сшытак, па матэматыцы, паклала проста на калекцыю. Ягоны, ягоны почырк.

Яна ўзяла анучу, пачала выціраць пыл. Пыл, пыл, каб не было ў пакоі гэтым пылу, пыл твой вораг, выцірай яго нафіг, ён нікому нічога добрага не зрабіў.

Калі пыл быў выцерты ў майстэрні й палове кабінету, вярнуўся і сам Пасюкевіч. Ён убачыў Волюшку з анучай, здагадаўся – цяжка не здагадацца – у якім яна настроі, кінуўся ў майстэрню... не. Майстэрня ўжо была прыбраная. Ідэальна прыбраная.

А недзе далёка-далёка гучаў голас – мужчынскі ці жаночы, Паша не зразумеў[1].

– Валі адсюль на ...! С-сука, кабёл ...ы! Вось табе! І п... пісьню сваю забірай! Талент!.. За... табе вырваць і ў рот запхаць! Д...еў! Ва!Лі! НА ...!!!.. Усё маме скажу!

І паехаў Пасюкевіч у вёску.

*Дадатак 1.* **Пералік асноўных твораў Паўла Пасюкевіча на 29 чэрвеня 1991 году.**

1. «Нацыя Кульмі», *паэма*
2. «Уводзіны ў самадызайн», *паэма ў эсэ*
3. «Нашая ўскраіна», *паэма*
4. «Запісная кніга», *паэма афарызмаў*
5. «Осьміявыя рыфмы», *набор паэзаў*
6. «Насьцянасьцянасьцянасьцяна», *PCX-файл, 32 градацыі шэрага*
7. «Маніфэст у творчасьці Паўла Пасюкевіча», *манаграфія*
8. «Ніштаваты – ніякаваты», *рыфма*
9. «Мовазнаўчы аналіз нелітаратурных тэкстаў П.Пасюкевіча», *эсэ*
10. «Для самых маленькіх», *інсталяцыя (піпеткі)*
11. «Маянэзная лірыка, або ТрубаНяДура», *паэзы*
12. «Народная газэта», *газета, стрыжань, надпісы*
13. «Мой памер», *інсталяцыя (паветраныя шарыкі)*
14. «Юрлінгвістычнага пэрыяду», *маніфэст*
15. «Літволат», *верш*
16. «Подыхі творчасьці», *верш*
17. «Памый мяне», *надпіс*

Яшчэ не канец!

18. «Партрэт маёй сястры», *відэёма*
19. «Скончался – списался», *рымаверш*
20. «Жыцьцеапісаньне паэта», *новы раман*

[1] Наступны абзац дзяўчатам лепей не чытаць.

***Разьдзел чацьвёрты I для Пасюкевіча апошні.***

**1.**

Дзед Нупрэй сядзіць на ложку і распавядае. Ложак высокі, з шарыкамі, мяккі-мяккі. У мяне на лецішчы такі ложак.

За вакном зіма, сапраўдная, з марозам ды сьнегам. Дзед паліць грубку. Ён пачаставаў мяне самапальным папкорнам, паразважаў пра Хрушчова, прыгадаў звычайныя ў такіх размовах «два дваццаць» і «тры шэсьцьдзясят дзьве» і ледзь-ледзь не раскруціў мяне на палітычную гутарку. Дзівам не раскруціў, як я цяпер разумею.

А тэлевізар, наадварот, сучасны. Ня імпартны, ня самы разапошні, але прынамсі каляровы і з гультайчыкам. Ловіць, акрамя расейскіх каналаў, два ўкраінскія, і, пакуль дзед Нупрэй зьбіраецца з думкамі – а прыпыняецца ён ці не пасьля кожнага сказу, – можна ўчуць якое-небудзь «Леворуч ці праворуч».

– Узяў ён, значыцца, ровар. Узяў той ровар з гаражу ў восем, можа восем дваццаць, дзета так. Узяў ровар і, ну там сеў на яго, менскі ровар, зялёны, і паехаў, мо ў дзевяць там, дзевяць пятнаццаць, вось, – так гаворыць дзед Нупрэй. – Сеў, значыць, і паехаў катацца. Ён катаўся. Ён, я так потым паняў, ён, думаю, на дарогу катацца паехаў. Вот ён, значыцца, і паехаў катацца на дарогу, ён часта на дарогу езьдзіў. Кожны дзень, бывала праз дзень езьдзіў.

– А скончылася як? – перапыніў я.

Пасюкевіча ў Нупрэевай хаце няма, і няма даўно. Вось я й выпытваю, куды ён зьнік.

– Нармальна, – адказвае дзед Нупрэй. – Скончылася добра. Знайшлі мы ровар, у балоце ляжаў.

## КАНЕЦ

### 2, або Deus ex Machine

Дзеда Нупрэя я распытваў пяць гадоў таму, а ў панядзелак сустрэў Пасюкевіча ля Саюзу пісьменьнікаў.

Альбо, дакладней, ён мяне.

Пасюкевіч набыў Мазду RX-8, зьзяў радасьцю і хацеў *падкінуць мяне куды мне трэба*. Але ж я сказаў, што літаб'яднаньне пад самым бокам, і калі яму хочацца паразмаўляць, то пойдзем абодва.

І, ведаеце, Пасюкевіч паабяцаў – не, наступным разам не атрымаецца, ня будзе ў Беларусі – паабяцаў праз два тыдні прыйсьці і ўсё-ўсё-ўсё распавесьці. Выглядае вельмі добра, і відаць, што і чалавек харошы. Адна бяда, што лысее – ды нават і лысее прыгожа.

Чакаем.